УДК 398.332.416:316.728(476.7)

# ЗАХОДНЕПАЛЕСКАЕ КАЛЯДАВАННЕ: УЗАЕМАСУВЯЗЬ МАТЭРЫЯЛЬНЫХ І ДУХОЎНЫХ КАШТОЎНАСЦЕЙ

***І. В. Хамутова,*** *аспірант установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

**Анатацыя.** Мэта артыкула – выявіць ролю матэрыяльнай культуры палешукоў у заходнепалескай каляднай абраднасці. Прааналізаваны канцэпты двара, традыцыйнай забудовы і традыцыйнага адзення ў тэкстах заходнепалескіх калядак і шчадровак. Выяўлена, што духоўная і матэрыяльная культура заўсёды існуюць у цеснай узаемасувязі. Тым не менш падчас каляднай абрадавай дзеі ўвага каляднікаў скіравана на сакральны бок дзеі, таму ў тэкстах толькі ўзгадваецца традыцыйнае жыллё, двор, але на іх не робіцца акцэнт.

**Ключавыя словы:** заходнепалескае калядаванне, абрад, матэрыяльная культура, духоўная культура, традыцыйная забудова, вобраз гаспадыні і гаспадара.

# THE WEST POLESIE CAROLING: THE RELATIONSHIP OF MATERIAL AND SPIRITUAL VALUES

***I. Khomoutova,*** *Postgraduate Student of the Educational Institution «The Belarusian State University of Culture and Arts»*

**Abstract.** The purpose of the article – to identify the role of material culture of polesians in the West Polesie caroling ritualism. To achieve this goal, the concepts of the yard, traditional development and traditional clothing are analyzed in the texts of West Polesian carols and caroling songs. It has been revealed that, certainly, spiritual and material culture always exist in close relationship. Nevertheless, during the Christmas ritual action, the attention of the carolers is directed to the sacred side of the action, so the texts mention only the traditional dwelling, the courtyard, but do not focus on them.

**Keywords:** the West Polesie caroling, ritual, material culture, spiritual culture, traditional development, the image of the owner and hostess.

Зварот да тэмы даследавання запатрабаваў больш шырокага этнаграфічнага разумення таго, што ўяўляе сабой матэрыяльная культура заходніх палешукоў: якія хаты бачылі перад сабой калядоўшчыкі, якой была мужчынская і жаночая вопратка і інш., бо менавіта гэта разам з духоўнай культурай дазволіла вылучыць Заходняе Палессе як асобны гісторыка-этнаграфічны рэгіён.

Мэта артыкула – выявіць ролю матэрыяльнай культуры палешукоў у заходнепалескай каляднай абраднасці.

Перад вачыма заходнепалескіх калядоўшчыкаў была традыцыйная сядзібная забудова: у адным выпадку аднарадная (пагоннага тыпу), радзей – скучаная (не звязаная паміж сабой). Двары цесна прымыкалі адзін да аднаго, часам два-тры дваровыя комплексы, якія належылі розным гаспадарам (звычайна сваякам), размяшчаліся ў адзін шэраг на агульнай сядзібе [1, с. 390]. Двор гаспадара – адна з найважнейшых тэм калядных песень. Можна прывесці шмат прыкладаў шчадровак, у якіх дзеянне адбываецца менавіта ў двары, які прадстаўляецца як багаты двор пана-гаспадара: «Господарыку, выйды но на двір», «А в нашого хазяіна стоить явор у дворі», «Пуд окном чорна хмара вьеця» – і гэта толькі ў адным заходнепалескім аг. Хацiслаў (Маларыцкі раён).

Найбольш характэрная структура традыцыйнага жылля: аднакамерная (першапачаткова) [5, с. 36], пазней – хата + сенцы [4, с. 43]; хата + сенцы + камора [2, с. 298]; альбо – хата + сенцы + варыўня (стопка) [4, с. 43]. Гэтыя этнаграфемы сталі часткай мастацкага ладу калядных песень. У другой палове XIX – пач. XX ст. яна ўскладнялася вылучэннем у сенцах кухні, што засталося па-за ўвагай каляднай творчасці.

Зруб жылля рабілі з расколатых ці распілаваных уздоўж бярвён (дыль), якія злучаліся ў своеасаблівы вугал – «у ка́ню» (на поўначы арэал абмяжоўваўся лініяй Драгічын – Хомск – Бяроза). У будаўніцтве гаспадарчых памяшканняў выкарыстоўвалі шула-слупавую канструкцыю з плятнёвымі сценамі, якія на зіму абкладвалі снапамі трыснягу ці саломы. Клець, свіран, сырнік будавалі на высокіх штандарах або па́лях. Канструкцыйнай асновай тыповых для Заходняга Палесся паўвальмавых з прычолкам стрэх з'яўляліся кроквы, што замацоўваліся па канцах бэлек. Стрэхі крылі саломай, трыснягом, чаротам, звязанымі ў невялікія снапкі («астрыжкі») [1, с. 390]. Гэта быў той рэальны фон, на які накладаўся ідэальны, створаны згодна з міфарытуальным зместам каляднай абраднасці.

Цікава адзначыць такі факт. Пры ідэалізацыі вобразу гаспадыні і гаспадара ў калядках звычайна не звяртаецца ніякай увагі на іх адзенне, нягледзячы на тое, што адзенне з'яўляецца важным этнічным і сацыяльным паказчыкам [3, с. 159]. Між тым даследчыкі гісторыі адзення засведчылі, што народныя строі вызначаліся самабытнасцю і

маляўнічасцю аздаблення, асабліва жаночага касцюма. Толькі ў Заходнім Палессі сустракаліся спадніцы з валенай воўны (буркі), блізкія да панёвы фартухі (затулкі), старасвецкія наміткі (хусты) з тонкіх адбеленых нітак, рытуальныя галаўныя ўборы. Найбольш распаўсюджаныя спосабы дэкарыравання адзення – узорыстае ткацтва, аплікацыя, гафрыраванне. Арнаментальным вырашэннем блізкія да адпаведных строяў мотальскія і пінска-івацэвіцкія ручнікі.

Падводзячы высновы, неабходна адзначыць, што духоўная і матэрыяльная культура ў соцыуме заўсёды існуе ў цеснай узаемасувязі. Аднак падчас каляднай абрадавай дзеі ўвага каляднікаў скіравана менавіта на сакральны бок дзеі, таму ў тэкстах толькі ўзгадваецца традыцыйнае жыллё, двор, але на гэтэх канцэптах не робіцца акцэнт.


*1.* Заходняе Палессе // Беларус. энцыкл. : у 18 т. / рэдкал.: Г. Пашкоў [і інш.]. – Мінск, 1996–2004. – Т. 18. Кн. 1 : Дадатак : Шчытнікі – Яя. – 2004. – С. 390–391.

*2. Цітоў, В. С.* Народная спадчына: матэрыяльная культура ў лакальна-тыпалагічнай разнастайнасці / В. С. Цітоў ; навук. рэд. Г. В. Штыхаў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1994. – 297 с.

*3. Цітоў, В. С.* Этнаграфічная спадчына. Беларусь. Традыцыйна-бытавая культура / В. С. Цітоў. – Мінск : Беларусь, 1997. – 205 с.

*4. Цітоў, В. С.* Этнаграфічная спадчына. Беларусь. Традыцыйна-бытавая культура / В. С. Цітоў. – 2-е выд. – Мінск : Беларусь, 2001. – 207 с.

*5. Якімовіч, Ю. А.* Драўлянае дойлідства Беларускага Палесся, XVII–XIX стст. / Ю. А. Якімовіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1978. – 149 с.